Падпісанне Пагаднення аб супрацоўніцтве паміж Навасібірскай дзяржаўнай абласной навуковай бібліятэкай і Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі адбудзецца сёння ў Мінску ў рамках Дзён Навасібірскай вобласці ў Рэспубліцы Беларусь. Падчас мерапрыемства пройдзе адкрыццё выстаўкі постараў, якія прысвечаны 100-годдзю з дня нараджэння лётчыка-знішчальніка, тройчы Героя Савецкага Саюза, маршала авіяцыі СССР А. І. Пакрышкіна. Адбудзецца перадача ў дар кніг навасібірскіх аўтараў ад ГА «Навасібірскае бібліятэчнае таварыства» і часопіса «Сібірскія агні». У рамках мерапрыемства запланавана сустрэча з членамі Саюза пісьменнікаў Расіі Міхаілам Шчукіным і Міхаілам Хлебнікавым.